Я помню этот взгляд, смотрящий сквозь меня, как будто в тот миг она находилась не со мной, а там, в своем прошлом. Сколько раз она рассказывала все эти истории людям, а ощущения от всего пережитого не изменились. «Такое не забывается» – сказала она.

Потом мы сидели молча, и каждый из нас по-своему сильно прочувствовал услышанное. Сейчас большинство людей, особенно молодежь, начинают относиться к празднованию дня победы не совсем серьезно, считая, что это было давно, аргументируя, что пора забыть все и жить дальше. Но такие истории возвращают людям чувства благодарности и осознания, что это на самом деле было ужасно и мы должны сделать все возможное, чтобы такого больше никогда не произошло. Цените мгновения, проведенные с близкими вам людьми, ведь никогда не знаешь, как повернется жизнь…

***Сямашка Я.А.***

## Успаміны пра Вялікую Айчынную вайну жыхарой случчыны

***Навуковы кіраўнік Струцінская Н.У.***

Не ведаў ты страху ніколі,
Быў верны і храбры ў баю.
За край, за Радзіму, за волю
Аддаў маладосць ты сваю…

*Якуб Колас.*

Случчына… Радзіма-маці, зямля нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў, што дзеля цябе жылі, крывёй і духам сваім цябе баранілі. Баранілі, каб на золку ўмывалі цябе крыштальныя росы і сваёй пяшчотай саграване сонейка, каб бела-ружовым вэлюмам квітнелі вёснамі сады, каб па зялёнай мурожнай траве бегалі і весела смяяліся дзеці, каб ткаліся нашы знакамітыя сурвэты і паясы, каб складаліся санеты і звінелі песні…

Любая, родная наша зямля! Багатым на розныя падзеі быў векавечны шлях твой, якім прайшлі праз стагоддзі сыны і дачкі твае. Заўжды найбольшай бядой для ўсіх народаў і цывілізацый былі войны. На жаль, яны і зараз яшчэ застаюцца спадарожнікамі чалавечага жыцця. Аднак іх разбуральнае ўздзеянне неаднолькавае ў розных мясцінах. Больш церпяць тыя, хто знаходзіцца на

скрыжаванні ваенных шляхоў. Сярод такіх мясцін і ты, мая родная Случчына. Колькі разоў рабавалі цябе, вораг таптаў твой жытні колас і стракатыя краскі твае? Самая свежая ў нашай памяці і таму, мабыць, самая трагічная для нас Вялікая Айчынная вайна вогненнай віхурай пранеслася над табою, наша родная зямля, знішчаючы ўсё на шляху. Якія страты – матэрыяльныя і духоўныя – панесла ты! Але самае каштоўнае з усяго страчанага – людзі. Разбуранае можна аднавіць, пабудаваць, зноў завораныя і засеяныя палі дадуць новыя ўраджаі, а людскія страты – беззваротныя.

Шмат герояў парадзіла ты – беларуская зямля! Твае сыны, рызыкуючы жыццямі, змаглі ўратаваць цябе ад выройжых праціўнікаў. Існуе вялікая колькасць прыкладаў гераізму і адвагі савецкага народу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Усе яны жывуць і зараз, і не толькі у сэрцах іх родных і блізкіх, але і, наогул, усяго чалавецтва. І, безумоўна, будуць жыць вечна. Я як жыхар Слуцка не магу не ацаніць тыя подзвігі, якія зрабілі мае землякі. Яны, не шкадуючы сябе, ваявалі з ворагам твар у твар да апошняй хвіліны, каб захаваць маю малую радзіму. Зараз я ўспомню, на мой погляд, самыя трагічныя моманты з успамінаў жыхароў горада і непасрэдных сведак тых страшных падзей.

Той незабыўны чэрвень 41-га. Чэрвень 1941. Той доўгі і трывожны сонечны дзень помніцца лепей, чым тое, што было ўчора. Яно і зразумела: мне тады ішоў пятнаццаты год, памяць была "ўчэпістая", а падзеі – вельмі ўражлівыя і трывожныя.

Пасля школы я пагадзіўся за працадзень пасвіць калгасных коней. У шэсць гадзін раніцы таго чэрвеньскага дня маці мяне пабудзіла, і я хуценька пашыбаваў да канюшні. Недзе праз паўгадзіны стрыножаны мой табун быў ужо за вёскай. Гадзін у восем ці дзевяць з боку Слуцка (туды ад нашай вёскі напрамкі 15 кіламетраў) пачуліся выбухі бомбаў. У неба ў тым баку пацягнуўся шнур чорнага дыму. Затым ужо і над нашай вёскай на невялічкай вышыні, – бо бачны былі жоўтыя канцы крылаў і чорныя крыжы на іх – сталі пралятаць на ўсход чацвёркі і шасцёркі двухматорных бамбардзіроўшчыкаў "Ю-88", а затым і адзіночныя самалёты. Па іх ні разу ніхто не страляў. А ў небе за цэлы дзень я не ўбачыў ніводнага нашага знішчальніка. Мяне, хлапчука, які верыў, што

Чырвоная армія “всех сильней”, а нашы лётчыкі і самалёты лепчыя ў свеце, гэта здзіўляла і засмучала.

Тады ж, 26 чэрвеня, зрэдку ў небе высока пралятталі на захад дзявяткі нашых двухматорных бамбардзіроўшчыкаў “СБ” – без прыкрыцця знішчальнікаў. Гадзіны праз 2 – 3 назад вярталіся па 3 – 4 машыны. Гадзін у 10 – 12 дня праз вёску ў бок Урэчча пачалі ісці адзіночныя і групамі, па 3 – 4 чалавекі, чырвонаармейцы – стомленыя, у мокрых ад поту гімнасцёрках. На пытанні майго дзядулі, дзе немцы, яны адказвалі коратка: “Уже в Слуцке». З размоў вайскоўцаў я падслухаў, што мост цераз Случ спалены, і яны раку пераплывалі. Пазней праз вёску пацягнуліся вайсковыя абозы з параненымі, а недзе гадзін у 16 – 17 над Слуцкам паўстала чорная сцяна дыму, а з боку в. Вясея сталі далятаць гарматныя стрэлы, кулямётныя чэргі, з неба там пікіравалі нямецкія “Ю-87”, ды так нізка, што хаваліся за лесам, што стаяў у паўночным напрамку ад нашай вёскі, а потым, адбамбіўшыся, узмывалі ў неба. Да самага вечара ў тым напрамку чулася страляніна, а потым усё сціхла. 27 чэрвеня паблізу вёсак Стары Гуткоў, Каліта, Кучына з гадзіну грымеў жорсткі бой…

З успамінаў Міхася Адамавіча Тычыны, жыхара Слуцка: “Я з вясковымі храпчукамі хадзіў пазней на поле таго бою сабіраць патроны. Узбоч шашы каля пасёлка Кучына стаяла наша 122-міліметровая гаўбіца, побач, у канаве, блішчэлі кінутыя снарады – штук трыццаць. Непадалёку чарнелі шкілеты трох спаленых грузавікоў ЗІС-5. А на палетку, за шашой, у вочы кінуўся россып зялёных касак, процівагазавых сумак. І ўсюды – патроны ў абоймах, кулямётных лентах. Падышла жанчына і ціха прамовіла: “Вось тут, хлопчыкі, мы два дні збіралі забітых нашых салдацікаў – немцы загадалі”. Мы ўбачылі брацкую магілу, дзе іх пахавалі. Над ёй стаяў высокі драўляны крыж. Сваіх немцы пахавалі ў адзіночныя магілы. І хоць карціна нямецкіх могілак парадавала нашы хлапечыя сэрцы, дамоў мы вярталіся азмрочаныя ўсім убачаным”.

Тэма вайны вялікую колькасць разоў закранулася ў літаратурных творах паэтаў і пісьменнікаў вядомых ва ўсім свеце. Не раз сустракалася ў кінематографе. І вядома па якой прычыне. Ну як магчыма не напісаць пра подзвігі тых адважных людзей? А героі былі ўсюды. І Слуцк не з’яўляецца выключэннем.

Подзвіг двух салдат.

26 чэрвеня раніцай перадавыя злученні танкавых і матарызаваных дывізій ворага ўварвалася на тэрыторыю Слуцкага раёна. Завязаліся баі каля мястэчка Леніна. Вораг падышоў ушчыльную да Слуцка. Лічачы, што ў горадзе ўжо няма савецкіх войскаў, немцы накіравалі па Пралетарскай вуліцы бронетранспарцёры з пяхотай. З паветра іх падтрымлівалі эскадрыллі самалётаў-знішчальнікаў. Вось ужо бронетранспарцёры з лязганнем імчацца каля ахопленага полымем будынка былога педвучылішча. Але што гэта? Уперадзе, каля цэнтра горада, маланкай бліснула полымя і амаль у той жа момант пад пярэднім бронетранспарцёрам з грукатам узрываецца артылерыйскі снарад. Ахопленая полымем машына хіліцца на бок, з яе вывальваюцца забітыя і параненыя салдаты. За першым узрывам другі, трэці, чацвёрты. Вось ужо з трох бронетранспарцёраў, загарадзіўшых вуліцу, у блакітнае чэрвеньскае неба павалілі слупы чорнага дыму. На маставой валяюцца трупы ворага. З ідучых ззаду бронетранспарцёраў узнялася беспарадкавая страляніна. А гармата пасылала снарад за снарадам у самую гушчыню варожай калоны.

Гэта два савецкія воіны, прозвішчы іх так і засталіся невядомымі, развярнулі гармату і сталі біць з яе прамой наводкай па калоне нямецкіх бронетранспарцёраў. Сустрэўшы супраціўленне, немцы вымушаны былі прыпыніць калону і накіраваць у абход некалькі танкаў. Два савецкія салдаты, адзін з якіх быў паранены ў галаву, расстраляўшы снарады, працягвалі весці агонь з кулямёта да апошняга патрона, пакуль чарга з варожага танка не абарвала жыцці мужных абаронцаў.

Невядомыя салдаты былі пахаваны на рагу вуліцы Пралетарскай і пад’езда да Дома культуры. Усе тры гады акупацыі на магіле ляжаў снарад калібру той гарматы, з якой салдаты вялі агонь па ворагу. Вясной і летам чыясьці невядомая рука прыносіла на магілу жывыя кветкі. Пасля вайны астанкі герояў былі перанесены на брацкія могілкі. Жыхары Слуцка ніколі не забудуць мужных абаронцаў роднага горада. (М. Васілюк, “За сацыялістычную Радзіму” 1957 г.).

Мужнасць невядомага лётчыка.

Ішоў шосты дзень Вялікай Айчыннай вайны. Па шасэ на Бабруйск, міма дагараючых каля пасёлка Кучына танкаў і машын з крыжамі на бартах рухаліся на ўсход матарызаваныя калоны ворага.

Раптам неба над вёскамі Немчае і Муравішчына прачарцілі пункціры трасіруючых куль, пачулася глухое ракатанне буйнакаліберных кулямётаў. Гэта савецкі знішчальнік атакаваў 12 нямецкіх самалётаў. Завязаўся кароткі, але жорткі бой. Нягледзячы на колькасную перавагу немцаў, савецкі знішчальнік смела атакаваў варожыя самалёты.

Вось што расказаў відавочца гэтага паветранага бою былы партызан Вялікай Айчыннай выйны Аляксандр Тарасавіч Зубарык: "Раніцай 28 чэрвеня 1941 г. савецкі знішчальнік завязаў бой з нямецкімі самалётамі. З першай чаргі ён падпаліў адзін з "юнкерсаў". Сцярвятнік упаў у бліжэйшы лес. Праз некалькі секунд, пакідаючы хвост чорнага дыму, да зямлі пачаў падаць другі "юнкерс", потым трэці. У гэты час у бой уступілі дзе "рамы" (нямецкі двухфюзеляжны самалёт-разведчык). Трапнай чаргой знішчальнік збіў адну "раму", другую дагнаў і рубануў вінтом. "Рама" нязграбна закружылася і пайшла на пасадку. Але загарэўся і наш самалёт. Ён упаў ва ўрочышчы Жукава Балота ў моцна забалочаным месцы. Матор і абломкі машыны зніклі ў багне. Пасля вайны матор быў выцягнуты разам з астанкамі лётчыка. Больш нічога знайсці не ўдалося".

Імя героя-лётчыка так і засталося невядомым Ідуць гады. Зарубцаваліся, Случчына, раны тваe, пакінутыя ваенным ліхалеццем. Каласіцца жыта, узняліся гмахі будынкаў. Але аб мінулым напамінаюць маўклівыя помнікі, што, углядаючыся ў нябесную сінь, нібыта кажуць вуснамі загінуўшых: "Памятайце, памятайце нас! Гэта мы, хто змагаўся за родны край, за радзіму-маці". Вечная слава загінуўшым у розныя часы за цябе, Случчына, за прадаўжэння жыцця на зямлі тваёй!

Нізкі паклон усім, хто з пажарышчаў і руін уздымаў цябе і сваёй руплівай працай і талентам засяваў і цяпер засявае поле тваёй гісторыі, Случчына!